*В. В. Калацэй*

# ГЕНАДЗЬ ЦІТОВІЧ І ПРАКТЫЧНАЯ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКА

Постаць Генадзя Іванавіча Цітовіча — аднаго з вядомых дзеячаў беларускай культуры XX ст. невыпадкова звязана з беларускім каранёвым меласам, у якім комплексна аб'яднаны нацыянальны характар, каштоўнасці, уяўленні аб прыгажосці, спосабы жыццезабеспячэння народа. Паколькі вытокі музычнага фальклору ўсіх еўрапейцаў — у неалітычных культах плоднасці і продкаў [3, с. 32—33], — насамрэч за з'яўленне паэзіі і музыкі Еўразіі «адказнасць» нясуць стваральнікі і носьбіты яе фальклорнай спадчыны. Нават вялікі Платон (у часы якога вершы і паэмы не дэкламаваліся, а спяваліся), калі разважаў аб прыродзе сапраўднай паэзіі, спасылаўся менавіта на народныя ўяўленні пра тэхналогію і асаблівасці паэтычнай творчасці [4, с. 223].

Адвечную каштоўнасць жывога фальклорнага мастацтва дэкларуюць многія сучасныя творцы, але толькі адзінкі з іх здольны комплексна «прапусціць» народны мелас і паэтыку роднага слова праз сэрца, розум і душу. А прапусціўшы перабраць вялікую колькасць варыянтаў і адшукаць аптымальны шлях, па якім менавіта «сёння і зараз» варта практычна рухаць «Песню — душу народа» [5, с. 5], каб яна аб'яднала розныя эпохі яго гісторыі з сучаснасцю і ў чарговы раз засталася яго аховай і паратункам ад пакут, прыгнёту і небяспекі страты сябе як адмысловай этнічнай адзінкі.

Поспех Цітовіча-капельмайстра, музыкі, педагога заўсёды быў «на віду», паколькі Дзяржаўны акадэмічны народны хор, які сёння носіць яго імя, вядомы і ў Беларусі, і далёка за яе межамі. Гэты калектыў неаднаразова выдатна прадстаўляў беларускую песню на вялікай сцэне. Хор, сабраны Генадзем Іванавічам пасля праграмнага артыкула беларускіх кампазітараў у газеце «Літаратура і мастацтва» ад 29 верасня 1951 г., павінны быў быць створаны «па ўзоры хору імя Пятніцкага і нацыянальных калектываў саюзных рэспублік» [2, с. 61] і мусіў працаваць для вельмі шырокай аўдыторыі. Яго творчасць была цікавай і блізкай не толькі аматарам каранёвага фальклору беларусаў, але і знаўцам прафесійнай харавой еўрапейскай музыкі.

На працягу 23-х гадоў кіраўніцтва дзяржаўным хорам Цітовічу ўдалося бліскуча праявіць веды, як выпускніку музыказнаўча-тэарэтычнага факультэта кансерваторыі — дыпламаванаму спецыялісту ў галіне музыкі пісьмовай традыцыі, і талент збіральніка песеннага фальклору — музыкі традыцыі вуснай, і шматгадовы досвед эдытара і «друкара» народных песень, што прынесла значны поспех калектыву.

Як збіральнік фальклору Цітовіч зрабіў шмат, сістэмна запісваў беларускія песенныя мелодыі Падзвіння з 1932 г. [2, с. 45], і на працягу ўласнай далейшай практыкі збіральніка-этнамузыколага значна пашырыў аб'ём і геаграфію асабістых сістэмных фалькларыстычных даследаванняў да ўсіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі і прылеглых частак Польшчы.

У якасці эдытара, «друкара» помнікаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны беларусаў Генадзь Іванавіч годна працаваў з 1948 г. (першая друкаваная падборка «Беларускія народныя песні для двух галасоў»). Потым былі «Песні беларускага народа» (1959) і фундаментальная «Анталогія беларускай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народнай песні» (1968 — 1-е і 1975 — 2-е выданні). У зборніках — сапраўды бліскучыя (па прадстаўленні разнастайнасці беларускай песні) выбар і камбінацыя тыпавых напеваў, іх дакладная натацыя і захаванне характэрнай рытмікі, што даволі складана пры эдыцыях традыцыйнага меласу, усё гэта праявілася дзякуючы вялізнаму аб'ёму этнаграфічных ведаў маэстра, яго тонкаму музычнаму густу, грунтоўнай і markознабаковай адукаванасці Цітовіча.

Сучаснікі невыпадкова аднымі з дамінуючых рыс характару Генадзя Іванавіча называюць чуласць, камунікабельнасць і пачуццё гумару. Менавіта шырыня асобы дазволіла паспяхова і арганічна здзяйсняць тое, што лічыцца прызваннем, — папулярызаваць і распаўсюджваць лепшыя ўзоры народнапесеннай творчасці Беларусі сродкамі харавога мастацтва. На гэтым шляху чакала шмат «падводных плыняў» і небяспек. Але прыродны такт, дабразычлівасць і здаровы сэнс ва ўсім заўсёды дапамагалі пераадольваць складанасці і весці праз непаразуменне і неспрыяльныя абставіны рэй **практычнай фалькларыстыкі**. Відавочна, Цітовіч мае бясспрэчнае права лічыцца адным з яе найбуйных зачынальнікаў на Беларусі, побач са сваім вялікім настаўнікам Рыгорам Шырмам.

Пачаткам практычна-фалькларыстычнай дзейнасці Цітовіча лічаць 1939 г., з якога ён працаваў адказным рэдактарам музычнага вяшчання ў Баранавічах [2, с. 51]. Трэба, аднак, падкрэсліць, што яшчэ ў 1931 г. у Вільні ён кіраваў аматарскім вакальным квартэтам «Баян», які выконваў народныя песні [2, с. 49]. Яго адданая праца са шматлікімі вясковымі самабытнымі спевакамі і фальклорнымі гуртамі розных рэгіёнаў Беларусі на працягу 1940-х дазволіла к 1950 г. сфармуляваць, як лічыць этнамузыколаг Т. Б. Варфаламеева «праграму ўласнай дзейнасці» [2, с. 54], якая носіць відавочна практычны кірунак і не страціла злабадзённасці і актуальнасці для фалькларыстаў-практыкаў XXI ст.

Згодна перакананням Цітовіча, фалькларыст — «не аб'ектыўны фіксатар з'яў, ён закліканы асабіста ўдзельнічаць у народнай творчасці», да таго ж, задача яго «выяўляць таленавітых самародкаў і дапамагаць ім». «Творчае стаўленне да народнага мастацтва дазваляе даследчыку глыбей пранікаць у фальклорныя працэсы і кіраваць імі», — адзначаў Генадзь Іванавіч, аднак папярэджваў, што: «Праўда, такое ўмяшальніцтва ў фальклорныя працэсы можа выклікаць іншы раз пярэчанне». Па меркаванні Цітовіча: «Фалькларыст — гэта сувязіст паміж асобнымі аўтарамі народных песень і шырокімі народнымі масамі. Значэнне збіральніка ў папулярызацыі запісаных ім песень нельга пераацаніць. Для папулярызацыі лепшых узораў... народнай творчасці збіральнікамі павінны быць выкарыстаны семінары..., святы песні, прэса, радыё і інш.» [2, с. 54].

Цалкам пазбаўлены снабізму, Генадзь Іванавіч з роўным задавальненнем кантактаваў і з акадэмічнай прафесурай, кампазітарамі, гуманітарнай багемай, і з вясковымі спевакамі, музыкамі, і з кіраўнікамі аматарскіх народных калектываў. Праслухоўваючы апошнія, ён без уліку ўласнага часу працаваў доўгія гадзіны ў складзе конкурсных камісій і журы, выязджаў у працяглыя камандзіроўкі. Паколькі Цітовіч добра ведаў стыхійную, разняволеную аснову фальклору, самавыяўленне, асабісты творчы ўнёсак народнага выканаўцы (як абавязковая складаючая жывой фальклорнай традыцыі) заўсёды ім вітаўся і заахвочваўся.

Як дасведчаны фалькларыст-практык Цітовіч аддаваў даніну сінкрэтычнасці фальклору, не «рэзаў па жывым», раскладаючы «па палічках» віды і жанры народнага мастацтва. Аналізуючы беларускія танцы ў песеннай анталогіі,





РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ
...ЯТЭКА ...а універсі... ...паўтэт
Інв. № 336 083

неаднаразова падкрэслівае, што «значная іх колькасць суправаджалася песнямі і прыпеўкамі», а «танцавальныя папеўкі — гэта інструменталізаваныя песенныя мелодыі» [1, с. 12]. Цітовіч адзначаў, што «склад інструментарыя аказаў значны ўплыў на развіццё... многагалосся ў беларускім песенным фальклоры», прыводзячы ў якасці прыкладаў «бурдонныя гукі ліры і дуды...» [1, с. 9]. Таму тыя, хто адраджаў каранёвы музычны інструментарый беларусаў, заўсёды маглі разлічваць на яго параду і дапамогу.



У. Я. Пузыня распавядае пра першае праслухоўванне Г. І. Цітовічам аднoўленай ім дуды

Народны майстар Уладзімір Якаўлевіч Пузыня шмат гадоў збіраў звесткі пра дуду ў архівах Польшчы, Беларусі і Расіі. Надышоў час, калі яго збіральніцкая дзейнасць знайшла практычны вынік: у сярэдзіне 1980-х выробленая ім дуда дала нарэшце гук, які быў характэрны для аўтэнтычных інструментаў, апісаных фалькларыстамі XIX—XX стст. Паколькі майстар у сваёй працы неаднаразова карыстаўся парадамі і ўспамінамі Цітовіча (родны дзядзька якога быў дударом), натуральна, што першы чалавек, якому ён прадэманстраваў вынік сваёй дзейнасці, быў Генадзь Іванавіч.

Вось як апісаў гэта сам У. Я. Пузыня ў інтэрв'ю праграме «Добрай раніцы, Беларусь!» (аўтар і вядучая тэлежурналістка Алена Грыкень) у лістападзе 2009 г. (*гл. мал.*). «Самы першы, хто пачуў гэты інструмент (я найграў, калі ён у мяне загучаў), — Цітовіч: я найграў на ім Цітовічу Генадзю Іванавічу. Патэлефанаваў, кажу: «Генадзь Іванавіч, загучала дуда». «А-ну, давай-ка там... раўкні...» Я пайграў. «Хуценька, да мяне!» Ён, калі сядзеў, ажно праслязіўся; не ад сталасці, а ад радасці: што ён пачуў дуду...».

Генадзь Цітовіч усё жыццё прысвяціў ахове і трансляцыі ў часе таго, што называў «магутным патокам нашай народна-песеннай стыхіі». Невыпадкова, што пры закліку да перайманя нематэрыяльнай культурнай спадчыны беларусаў[1] «духоўны» спосаб яе асваення, г. зн. *практычны спосаб пераемнасці і перажывання*, далучэння да яе, ён ставіў ***перад*** *«пісьмовым» — апісальным і аналітычным* [1, с. 18]. Як паказаў час, нашчадкам трэба значна больш уважліва і стромка прыслухоўвацца да запаветаў разумных і дасведчаных папярэднікаў, каб не страціць тое, што ім спрадвеку наканавана ў спадчыну.


*Літаратура*

1. Анталогія беларускай народнай песні / укл., прадм. і каментарыі Г. Цітовіча. — Мінск : Беларусь, 1975. — 616 с.
2. *Варфоломеева, Т.* Геннадий Титович / Т. Варфоломева // Працяг будзе... / укл. М. Козенка. — Мінск : БелДІПК, 2004. — С. 45—70.
3. *Калацэй, В.* Параўнальная міфалогія / В. Калацэй. — Мінск : Зорны верасень ; Паркус плюс, 2009. — 116 с.
4. *Розин, В.* Семиотические исследования / В. Розин. — М. : ПЕР СЭ ; СПб. : Университетская книга, 2001. — 256 с.
5. *Шырма, Р.* Песня — душа народа / Р. Шырма. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1976. — 220 с.


[1] У прадмове да фундаментальнай працы — песеннай анталогіі.



РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ